РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 ЛІПЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 145 (30533)

# ПОПЫТ НА ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

## Набор у каледжы сёлета ў паўтара раза большы, чым у ВНУ

Падводзіць вынікі прыёму ў сярэднеспецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы яшчэ рана (тым больш што ў некаторых прыём дакументаў будзе падоўжаны), але папярэднія лічбы гучаць вельмі аптымістычна. Учора міністр адукацыі агучыў статыстыку: набор у каледжы прыкладна ў паўтара раза большы за набор у ВНУ.




І гэта не выпадковасць, а планамерная дзяржаўная палітыка: краіне патрэбны рабочыя рукі. Прычым рукі прафесіяналаў, якія валодаюць самымі сучаснымі кампетэнцыямі. «Мы будзем інжынерныя, рабочыя спецыяльнасці ўзнімаць на самы высокі ўзровень, — сказаў Аляксандр Лукашэнка падчас «Адкрытага мікрафона» са студэнтамі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў верасні мінулага года. — Таму што гэта дзяржаве трэба, гэта стратэгія. Калі мы не будзем займацца гэтым цяпер, то заўтра будзе не да гаджэтаў».

Сёння каледжы прапануюць атрыманне прафесійнай адукацыі па дзвюх сотнях спецыяльнасцяў, запатрабаваных у рэальным сектары эканомікі. Ёсць прапанова, але ёсць і попыт: на некаторыя спецыяльнасці конкурс па некалькі чалавек на месца. І новае пакаленне паступае не ў «хабзу», а вучыцца, каб атрымаць прафесію, якая гарантуе і рабочае месца, і добры заробак. Ламаюцца часовыя стэрэатыпы, вяртаюцца спрадвечныя каштоўнасці — працавітасць і майстэрства заўсёды былі ў беларусаў у пашане.

Значыць, усё, што патрэбна краіне, зможам і будзем рабіць самі, а гэта як мінімум адзін са складнікаў сапраўднай незалежнасці.

**(Працяг тэмы — у матэрыялах сённяшняга нумара.)**



Фота БелТА.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

АГРАРНАЯ ЗМЕНА РАТАВАЛЬНІКА



4–5

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ДАПАМОГІ, ПЕНСІІ, АПЕРАЦЫІ ПА КАРТКАХ

### Што змяняецца з 1 жніўня?

З названага дня павышаецца бюджэт пражытачнага мінімуму — велічыня, ад якой залежыць шэраг выплат — ад дзяржаўных дапамог пры нараджэнні дзяцей і «ўзроставых» даплат да пенсій да падтрымкі пры падрыхтоўцы да школы і субсідый на арганізацыю сваёй справы. Расказваем, якія дапамогі і на колькі вырастуць, а таксама ўзгадаем пра іншыя важныя змяненні.




СТАР. 8-9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

КАМПЕТЭНТНА

# АД СІБІРЫ ДА АФРЫКІ

**«Адкрытасць да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва незалежна ад геаграфіі»: эксперты — аб нядаўніх сустрэчах, якія адбыліся ў Палацы Незалежнасці**

Эканамічнае ўзаемадзеянне па ўсіх напрамках і кантынентах: днямі ў Палацы Незалежнасці прайшла сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам Цюменскай вобласці, а на наступны дзень — з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Эфіопіі. Расія — наш стратэгічны і даўні партнёр, а Эфіопія — новы рынак. На першы погляд, абсалютна розныя напрамкі, але ў той жа час аб'ядноўвае іх адно — жаданне дзейнічаць на карысць эканамічнага развіцця сваіх краін. Як заўсёды падкрэслівае Прэзідэнт, мы адкрытыя для партнёрства з тымі, хто ў ім зацікаўлены. І гэтыя сустрэчы — прамы таму доказ. Нашы эксперты ацанілі значэнне праведзеных сустрэч для далейшага развіцця супрацоўніцтва з зацікаўленымі працаваць з намі партнёрамі і ўмацавання эканамічнага патэнцыялу краіны.

## АБСТАЛЯВАННЕ ДЛЯ НАФТАГАЗАЗДАБЫЧЫ, ТРАНСПАРТ, ПРАДУКТЫ



Пачнём з першай сустрэчы — з губернатарам Цюменскай вобласці Аляксандрам Маорам. У Беларусі і гэтага расійскага рэгіёна ёсць вельмі шмат магчымасцяў для ўзаемадзеяння і імі трэба карыстацца. Пра гэта ў эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» заявіў **дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ.**

Сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з чарговым расійскім губернатарам, а менавіта з кіраўніком Цюменскай вобласці, — гэта паказчык стабільнасці, наладжанасці адносін і правільнасці выбудаванай мадэлі ўзаемадзеяння з Расіяй, адзначыў госць эфіру:





— Ёсць найвышэйшае палітычнае кіраўніцтва Расіі, з якім наш кіраўнік дзяржавы пастаянна знаходзіцца ў кантакце. Але таксама вядзецца праца на месцах — з губернатарамі, прадстаўнікамі расійскіх рэгіёнаў. Яна дазваляе зверыць канкрэтныя напрамкі, у разрэзе рэгіёнаў ацаніць, што Беларусь можа даць Расіі, а Расія — Беларусі.

З Цюменскай вобласцю ў нас наладжаны цесныя адносіны, канстатаваў Аляксей Бяляеў:

— Цюмень — гэта нафта, Беларусь — нафтаперапрацоўчыя заводы. Да санкцыйнага ціску перапрацоўка нафты, пастаўка нафтапрадуктаў на еўрапейскі рынак былі прыбытковым бізнесам. Цяпер краіне патрэбны свой бензін — ідзе ўборачная, у нас велізарная колькасць прыватнага і грамадскага транспарту. Таму бесперабойныя пастаўкі нафты з Цюмені вельмі важныя.

Эксперт падкрэсліў, што Беларусь нямала ўкладвае ў Цюменскую вобласць, і падзяліўся развагамі, якія кірункі супрацоўніцтва можна пашыраць:

— У Цюмень сыходзіць наша высокатэхналагічнае абсталяванне для нафтагаздабычы. Ва ўмовах санкцый гэта абсталяванне пастаўлялі замежныя кампаніі, а цяпер гэту нішу займае Беларусь. Хацелася б пашырыць лінейку тавараў аўтамабільнай прамысловасці, якія пастаўляюцца. У нас у вялікай колькасці выпускаюцца аўтобусы, электробусы — мы пастаўляем іх на расійскі рынак у іншыя рэгіёны, гатовыя пастаўляць і ў Цюмень. Наша краіна таксама з'яўляецца пастаўшчыком якасных прадуктаў харчавання. Мяркую, Цюменская вобласць мае патрэбу ў іх, бо яе сельская гаспадарка не самая лепшая і прыбытковая.

Існуючыя кірункі супрацоўніцтва з Цюменню павінны развівацца, перакананы Аляксей Бяляеў:

— За мінулы год тавараабарот Беларусі з Цюменскай вобласцю перавысіў 3,5 мільярда долараў, гэта вельмі сур'ёзны паказчык. Адна гэта вобласць дае значную частку агульных абменаў таварамі, капіталамі.

## ТРЫВАЛЫ ПАДМУРАК ЭКАНАМІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА



Візіт губернатара Аляксандра Маора і яго перагаворы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам — яркае пацвярджэнне стратэгічнага курсу на паглыбленне інтэграцыі з ключавымі рэгіёнамі Расіі, у сваю чаргу звяртае ўвагу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар ЖУК.**



Ён выказаў упэўненасць, што прапанаванае прыцягненне незалежных цюменскіх экспертаў для ацэнкі перспектыў нафтаздабычы ў Беларусі — узважаны крок для максімізацыі патэнцыялу нашых нетраў. А пашырэнне паставак беларускага нафтагазавага абсталявання, транспарту (у тым ліку электробусаў) і супрацоўніцтва ў высокатэхналагічных сферах, такіх як газатурбінныя ўстаноўкі і біябяспека — канкрэтныя вектары для нарошчвання тавараабароту і ўмацавання тэхналагічнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і Цюменскай вобласці ў рамках адзінай эканамічнай прасторы.

— Асабліва каштоўна, што трывалы падмурак эканамічнага партнёрства заснаваны на агульнай гістарычнай памяці і павазе да подзвігу нашых бацькоў і дзядоў, якія вызвалялі свет ад фашысцкага прыгнёту, — падкрэсліў сенатар.





## НОВАЯ СТАРОНКА Ў ЭКАНАМІЧНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ БЕЛАРУСІ

Расія для Беларусі — не проста сусед, а надзейны стратэгічны партнёр, з якім наладжаны глыбокія эканамічныя, палітычныя і гуманітарныя сувязі, падкрэслівае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр ГАРОШКІН.** Ён нагадаў, што ў рамках Саюзнай дзяржавы і Еўразійскага эканамічнага саюза Беларусь і Расія актыўна працуюць над паглыбленнем інтэграцыі, развіццём вытворчай каапераці, пашырэннем тавараабароту і сумеснымі праектамі ў розных галінах.

— Цюменская вобласць, як адзін з вядучых рэгіёнаў Расіі, валодае значным эканамічным патэнцыялам і з'яўляецца важным звяном у гандлёва-эканамічных адносінах. Гэта ўзаемадзеянне з'яўляецца залогам стабільнасці і ўзаемнага росквіту для абедзвюх краін, — адзначыў ён.

У той жа час, сенатар звяртае ўвагу, што сустрэча з міністрам замежных спраў Эфіопіі адкрывае новую, але не менш важную старонку ў эканамічнай дыпламатыі Беларусі:

— Эфіопія, размешчаная на Афрыканскім кантыненце, уяўляе сабой рынак з велізарным патэнцыялам росту, які дынамічна развіваецца. Для Беларусі гэта магчымасць знайсці новыя нішы для сваёй прадукцыі і паслуг, а таксама пашырыць геаграфію сваёй эканамічнай прысутнасці.



Сенатар канстатуе: Афрыка ў цэлым, і Эфіопія, у прыватнасці, дэманструюць устойлівы эканамічны рост, развіццё інфраструктуры і рост попыту на якасныя тавары і тэхналогіі.

— Як падкрэслівае наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, Беларусь адкрыта для партнёрства з тымі, хто ў ім зацікаўлены. Незалежна ад геаграфічнага становішча або ступені даўнасці адносін, Беларусь імкнецца выбудоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, заснаванае на павазе, даверы і агульных інтарэсах.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Дзяніс КАРАСЬ** звяртае ўвагу, што Эфіопія — адзін з лідараў азіяцкага Саюза, член БРІКС:

— Гэта краіна, якая дае нам пэўныя магчымасці. Аснова эканомікі Эфіопіі — сельская гаспадарка. Гэта адна з перадавых краін, у якой вельмі развіта ў тым ліку сельская гаспадарка. Таму ёсць магчымасць (беларускаму боку. — **Заўв. аўт.**) падзяліцца сваімі тэхналогіямі, вопытам у афрыканскай прасторы, паказаць на новым рынку пазнавальнасць нашых прадпрыемстваў, беларускага брэнда.

Парламентарый адзначае, што гэта дае і магчымасці для прадстаўніцтва беларускіх прадпрыемстваў, кампаній у афрыканскім рэгіёне:

— Машынабудаванне, розная тэхніка, угнаенні і шмат-шмат-шмат усяго. Таму што, як кажа Прэзідэнт: «Дайце мне эканоміку». А ўсё ж такі эканоміка ад разумення слова не эканоміць, а ўменне эфектыўна весці гаспадарку. Вось менавіта гэтым Прэзідэнт і займаецца, умее эфектыўна весці гаспадарку, і ў тым ліку ён нарошчвае знешні гандаль на больш высокі, макраўзровень. Адпаведна, як вы бачыце, далёкая дуга — гэта афрыканскія краіны.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** звяртае ўвагу на тое, што адносіны Беларусі і краін глабальнага Поўдня значна ўмацаваліся дзякуючы шматвектарнай знешняй палітыцы, якая рэалізуецца пад кіраўніцтвам Прэзідэнта нашай краіны:

— У сучаснай складанай і напружанай абстаноўцы ў свеце, якая ўзнікла па віне асобных заходніх агрэсіўных дзяржаў, як ніколі востра стаіць пытанне аб абароне эканамічных інтарэсаў нашай краіны, аб актывізацыі нашых намаганняў па наладжванні эканамічных і навукова-тэхнічных сувязяў з дружалюбнымі афрыканскімі дзяржавамі. Асабліва з тымі, з якімі яшчэ ў савецкі перыяд былі ўсталяваныя справядлівыя партнёрскія адносіны і якім у тыя далёкія гады была аказана істотная падтрымка ў барацьбе за ўмацаванне нацыянальнай незалежнасці.

Парламентарый адзначае, што сустрэча беларускага лідара з міністрам замежных спраў Эфіопіі Гедыёнам Тыматэвасам толькі пацвярджае той відавочны факт, што развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў нашай знешняй палітыкі:

— Пры гэтым Беларусь улічвае асаблівасці і інтарэсы кожнай афрыканскай краіны, з якой узаемадзейнічае ў эканамічнай, палітычнай і гуманітарнай сферах, што дазваляе паступальна ўмацоўваць не толькі нашы гаспадарчыя сувязі ў гэтым рэгіёне планеты, але і зрабіць іх вельмі пажаданымі, выгаднымі і ў многіх выпадках жыццёва неабходнымі для саміх афрыканцаў.

Дарэчы, Эфіопіі мы прапануем прадукцыю машынабудавання, сельскагаспадарчую тэхніку, сучасныя тэхналогіі і шырокі спектр адукацыйных паслуг. Нашы ўніверсітэты гатовыя навучаць эфіопскіх студэнтаў па запатрабаваных на сусветным рынку працы спецыяльнасцях. Захоўваюць актуальнасць і пастаўкі харчавання.

— Гэта асабліва важна для краіны з насельніцтвам амаль 129 мільёнаў чалавек, — перакананы Алег Дзячэнка.

У бліжэйшай перспектыве ўбачыць свет дарожная карта беларуска-эфіопскага супрацоўніцтва, рэалізацыя якой станоўча адаб'ецца на беларускай эканоміцы, упэўнены ён.

— Залогам жа паспяховага вырашэння задач эканамічнага прагрэсу нашых краін стала сустрэча ў Палацы Незалежнасці і дасягнутыя дамоўленасці аб інтэнсіфікацыі гаспадарчых сувязяў, — рэзюмаваў намеснік старшыні профільнай камісіі.



Як адзначае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ**, падсумоўваючы вынікі сустрэч у Палацы Незалежнасці, на першы погляд, напрамкі сапраўды розныя: даўні стратэгічны саюзнік і новы перспектыўны партнёр на афрыканскім кантыненце:

— Але іх аб'ядноўвае галоўнае: узаемная зацікаўленасць у практычнай, выніковай рабоце на карысць эканамічнага развіцця нашых краін. І Беларусь, валодаючы ўнікальным вопытам, кампетэнцыямі і якаснай прадукцыяй, выступае надзейным партнёрам у абодвух выпадках.

Суразмоўца падкрэслівае, што такія сустрэчы — не разавыя падзеі, а звёны ў паслядоўнай рэалізацыі курсу Прэзідэнта:

— Яны пацвярджаюць: нягледзячы на любое недружалюбнае знешняе асяроддзе, Беларусь захоўвае і нарошчвае эканамічныя сувязі па ўсіх вектарах. Мы адкрытыя да дыялогу і гатовыя да супрацоўніцтва з усімі, хто падыходзіць да яго канструктыўна і з павагай да ўзаемных інтарэсаў. Як падкрэслівае Аляксандр Рыгоравіч, нашы дзверы для ўзаемавыгаднага партнёрства заўсёды адкрытыя, і госці ў Палацы Незалежнасці — лепшае таму пацвярджэнне.






АКЦЭНТЫ

# ФУНДАМЕНТ БУДУЧЫНІ

## Макеты дзяржпраграм на 2026—2030 гады разгледзелі ва ўрадзе



Фота БелТА.

**Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН правеў пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў па тэме дзяржпраграм на 2026—2030 гады, паведамляе БелТА.**

— Сёння на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна разгледзім макеты дзяржаўных праграм на наступную пяцігодку. Мы павінны зрабіць так, каб дзяржаўныя праграмы забяспечвалі выкананне ўсіх мэт і задач, якія для сябе ставім на 2026—2030 гады. Немалаважна, каб якасныя індыкатары гэтых праграм карэлявалі з мэтамі і задачамі наступнай пяцігодкі, — сказаў Аляксандр Турчын.

**У Беларусі распрацоўваецца пяцігадовая праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця. Яна рэалізуецца праз дзяржаўныя, галіновыя і рэгіянальныя праграмы, а таксама навукова-тэхнічныя.**

— Дзяржпраграмы — асноўнае ў рэалізацыі мэт, задач і прыярытэтаў будучай пяцігодкі. Мы разам з рэгулятарамі вызначылі пералік. Перад гэтым правялі вялікую работу, вызначылі, якія выкрышталізаваліся недахопы ў гэтай пяцігодцы. Гэтыя праблемы нам трэба вырашыць пры падрыхтоўцы будучых праграм. Усе дзяржпраграмы павінны быць дакладна накіраваны на выкананне задач будучай пяцігодкі, індыкатары павінны адпавядаць мэтам і задачам — гэтыя прынцыпы самыя асноўныя. Яшчэ адзін важны момант — кіравальнасць. У кожнай дзяржпраграмы адзіны рэгулятар і заказчык — міністэрства, на чале міністр, ён адказны за выкананне ўсіх асноўных паказчыкаў. Усе праграмы скіраваны на выкананне пэўных прыярытэтных кірункаў пяцігодкі, і за кожны адказны віцэ-прэм'ер. Такім чынам, мы выконваем прынцып каскадзіравання, вертыкалізацыі, — адзначыў міністр эканомікі Юрый Чабатар.

У параўнанні з бягучай пяцігодкай у Беларусі істотна аптымізавалі сістэму: у 2026—2030 гадах будзе менш праграм сацыяльна-эканамічнай накіраванасці, значна скарочана колькасць паказчыкаў, увага засяроджана выключна на праектных кірунках.

**— Наша задача — каб кожнае мерапрыемства ў дзяржпраграмах працавала на мэтавы паказчык.**

Мы павысім кіравальнасць і адказнасць. Разам з рэгулятарамі падрыхтавалі прыкладныя макеты будучых дзяржпраграм, у іх ёсць мэты, задачы, паказчыкі. На сёння гэта 19 праграм сацыяльна-эканамічнай накіраванасці, а таксама праграма інавацыйнага развіцця. Яны ўтрымліваюць 60 падпраграм, гэта значыць, у сярэднім тры на кожную праграму і прыкладна 120 мэтавых паказчыкаў. Спадзяёмся, што гэта будзе кампактная, кіраваная сістэма на будучую пяцігодку, — сказаў на заканчэнне міністр.

ЗАКАНАТВОРЧАСЦЬ

# ДАКТЫЛАСКАПІЧНЫ КАНТРОЛЬ І «ДАРАГОЕ» СМЕЦЦЕ

## Экспертным саветам пры Савеце Рэспублікі разгледжаны законапраекты, накіраваныя на павышэнне нацбяспекі і адказнасці за забруджванне навакольнага асяроддзя


Фота БелТА.

Такая форма, калі найважнейшыя для краіны заканадаўчыя рашэнні праходзяць праз своеасаблівы «фільтр», добра сябе зарэкамендавала. Прыцягненне шырокага кола спецыялістаў да абмеркавання нарматыўных прававых актаў дазваляе прымаць узважаныя і абдуманыя рашэнні, усебакова разглядаць прапанаваныя навацыі, ацэньваць патэнцыяльныя рызыкі ад іх рэалізацыі на практыцы. З пачатку работы экспертнага савета разгледжана 317 дакументаў, 90 з іх падтрымана без заўваг.

### ДЗЕЙНІЧАЦЬ НА АПЯРЭДЖАННЕ

Праект Закона «Аб змяненні законаў» прадугледжвае карэкціроўку законаў «Аб дзяржаўнай дактыласкапічнай рэгістрацыі», «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь», «Аб органах пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь», «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь». Унясенне змяненняў і дапаўненняў абумоўлена выкананнем даручэння Прэзідэнта аб пачатку правядзення з 1 красавіка 2026 года органамі пагранічнай службы ў ходзе ажыццяўлення пагранічнага кантролю абавязковай дактыласкапічнай рэгістрацыі замежных грамадзян, якія перасякаюць Дзяржаўную граніцу Беларусі.

Законапраектам, ключавая сутнасць якога — забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, прадугледжана правядзенне дзяржаўнай дактыласкапічнай рэгістрацыі замежных грамадзян, асоб без грамадзянства і грамадзян Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з пералікам асоб, якія падлягаюць абавязковай дактыласкапічнай рэгістрацыі. Гэта паўплывае і на падтрыманне грамадскай бяспекі, зніжэнне ўзроўню злачыннасці і крыміналізацыі грамадства.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** падтрымала меркаванне экспертаў аб тым, што ўводзіць дактыласкапічную рэгістрацыю ў дачыненні да замежных грамадзян, асоб без грамадзянства і грамадзян Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі нашай краіны трэба як мага хутчэй. «Расце колькасць грамадзян, якія прыязджаюць сюды, і сярод іх ёсць тыя, хто здзяйсняе правапарушэнні, — заўважыла спікер. — Цяперашняя абстаноўка абавязвае, і людзі да гэтага ставяцца з велізарным разуменнем».

### ЗА ВЫКІНУТУЮ ПАПЕРКУ — АДКАЗНАСЦЬ РУБЛЁМ

Другое пытанне, якому ўдзялілі ўвагу члены экспертнага савета, — карэкціроўка палажэнняў Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях з мэтай узмацнення або ўвядзення адміністрацыйнай адказнасці за правапарушэнні, звязаныя з неналежным утрыманнем населеных пунктаў, тэрыторый ляснога фонду, іншых тэрыторый.

Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях дапаўняецца асобным артыкулам (16.46) аб адказнасці за невыкананне карыстальнікамі зямельных участкаў або водных аб'ектаў абавязку па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці асобных відаў раслін з устанаўленнем штрафу ў памеры да 10 базавых велічынь. Паўнамоцтвамі па складанні пратаколаў і разглядзе такіх спраў надзяляюцца органы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Павышаецца верхні парог штрафу за забруджванне лесу адходамі або сцёкавымі водамі: з 10 базавых велічынь у дзеючай рэдакцыі Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях да 30 базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — з 25 да 100, на юрыдычную асобу — з 50 да 1000 базавых велічынь. Павышаецца памер штрафу за выкіданне смецця, іншых прадметаў з транспартнага сродку: ён складзе ад дзвюх да 10 базавых велічынь (цяпер — ад адной да дзвюх).

Па словах **міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргея МАСЛЯКА**, устаноўленыя на бягучы момант штрафныя санкцыі недастаткова матывуюць людзей, якія праязджаюць па аўтадарогах краіны, выкідаць смецце ў прызначаных для гэтага месцах. «Пачасціліся факты захламлення адходамі тэрыторый уздоўж аўтамабільных дарог, што прыводзіць да фінансавых выдаткаў, звязаных з работамі па ачыстцы тэрыторый, — канкрэтызаваў міністр. — Усяго за 2024 год падчас прыбірання паласы адводу рэспубліканскіх аўтамабільных дарог вывезена больш за 6 тысяч тон адходаў».

Нягледзячы на шырокую работу, якую праводзіць Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, назіраецца рост колькасці інвазійных раслін (у прыватнасці, баршчэўніку Сасноўскага і сумніку канадскага), якія з'яўляюцца небяспечнымі для здароўя чалавека.

У размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ** паведаміў, што эксперты ўнеслі прапанову азнаёміць людзей з інвазійнымі відамі раслін, а ўжо потым выносіць прадпісанне, калі гэтыя расліны не будуць прыбраны з падпарадкаванай ім тэрыторыі. Па яго словах, звычайныя людзі, тыя ж жыхары вёсак часта не ведаюць, як выглядае, скажам, баршчэўнік Сасноўскага. «Меры ўзмацнення жорсткасці павінны суправаджацца тлумачальнай работай, — перакананы сенатар. — Неабходна прыйсці да чалавека, паказаць, расказаць і выдаць прадпісанне. Калі ж меры не будуць прынятыя, тады ўключыцца механізм адміністрацыйнай адказнасці».

Міхаіл Русы падкрэсліў, што законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці» з'яўляецца часткай агульных намаганняў па наводзінах парадку на ўсёй тэрыторыі краіны ў рамках патрабаванняў кіраўніка дзяржавы. Ён дадаў, што прадугледжана павелічэнне адказнасці за забруджванне лясоў, прылеглых тэрыторый і тэрыторый прадпрыемстваў.

Прыняцце законапраекта з улікам дапрацовак забяспечыць мясцовым органам улады, кантрольным органам, іншым кампетэнтным установам істотныя інструменты для захавання прыроднай прыгажосці краіны. «Самае галоўнае — разумець: чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе не смецяць, — заўважыў Міхаіл Русы. — Таму трэба пачынаць з сябе, каб не дапускаць наступстваў, якія потым давядзецца ўстараняць».

**Вераніка КАНЮТА.**

ЖНІВО-2025

# З ДЗЯЖУРСТВА

## Ратавальнік Станіслаў Сомаў нясе

Кіраўнік ААТ «Ляснянскі Агра» Анатоль Камароў ацэньвае сёлетні ўраджай збожжавых на «выдатна». Летась непагадзь палажыла шмат пасеваў, а вось цяпер пакуль усё добра — нядаўняя бура абышла раён бокам. На днях тут прыступілі да ўборкі аўса, ураджайнасць якога складае 40 ц/га. Надвор'е між тым няўстойлівае, трэба спяшацца сабраць збожжа. Аграрый прызнаецца, што вельмі дапамагаюць гаспадарцы памочнікі, якія сталі ў гаспадарцы не працуюць. Сярод іх — і ратавальнік-кіроўца Станіслаў СОМАЎ.

Сам Станіслаў родам з аграгарадка Лясная, у старшых класах летам падпрацоўваў у калгасе «Жалезінскі АГРА». Жыццё вырашыў звязаць з вёскай па прыкладзе бацькоў, якія працавалі ў гаспадарцы: бацька слесарам, а маці жывёлаводам. А вось іх сына больш цягнула да тэхнікі. Пасля школы пайшоў вучыцца ў ліцэй, дзе атрымаў адразу некалькі спецыяльнасцяў: трактарыст-машыніст катэгорыі С, муляр і слесар. Усе веды і навыкі вельмі ў жыцці спатрэбіліся. Пасля заканчэння малады хлопец працаваў у калгасе спачатку на трактары, а калі перасеў на камбайн, іншая тэхніка стала ўжо нецікавая.

Так склаліся абставіны, што Станіслаў ажаніўся і пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў райцэнтр. Цяпер ён кіроўца аўтацыстэрны ў ПАВЧ № 1 Слаўгарадскага РАНС. Расказвае, што падчас уборачнай часта з таварышамі па службе выязджае ў поле на дзяжурства, каб прадухіліць надзвычайныя сітуацыі. Сёлета тэхніцы ў полі не дае шчыраваць дажджлівае надвор'е. Аднак расслабляцца нельга. У аўтацыстэрне Станіслава заўсёды больш за дзве тоны вады. Дастаткова, каб утаймаваць вогненную стыхію.

Дарэчы, ён сам адзначае, што за час работы ў сістэме МНС яшчэ больш сябе дысцыплінаваў і загартаваў і сёння за штурвал камбайна «Палессе КЗС-1218» садзіцца з яшчэ большай адказнасцю. Тэхніка бяспекі заўсёды ў яго на першым плане. І таварышам па жніве раіць не грэбаваць гэтымі правіламі. Павінны быць вогнетушыцель, а на камбайн лепш два або тры, аптэчка.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# З АКЦЭНТАМ НА

## Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні

Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Мінсельгасхарча па выніках сустрэчы міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Юрыя ГОРЛАВА з міністрам Галоўнага мытнага ўпраўлення КНР Сунь Мэйцзюнь у Пекіне.

Бакі падпісалі абноўлены двухбаковы Пратакол па інспекцыі, каранціне і ветэрынарна-санітарным патрабаванням для птушкі, што экспартуецца з Беларусі ў Кітай. Юрый Горлаў падкрэсліў, што сельская гаспадарка — гонар нашай краіны, а беларуская прадукцыя карыстаецца попытам у кітайскіх спажыўцоў.

На бягучы момант у мытнай сістэме Адзінага акна Кітая (Сайфер) зарэгістравана 188 беларускіх вытворцаў харчовай прадукцыі. Міністр выказаў упэўненасць, што вынікі перагавораў паслужаць асновай для далейшага прафесійнага дыялогу і адпавядаюць стратэгічнаму ўзроўню даверных адносін паміж краінамі. Абмяркоўвалася арганізацыя паставак беларускай птушкаперапрацоўчай прадукцыі на кітайскі рынак з акцэнтам на пытаннях адпаведнасці прадукцыі патрабаванням КНР па якасці і бяспецы.



# ПАЖАРНАГА — НА ДЗЯЖУРСТВА ХЛЕБНАЕ

## вахту па ахове зернеўборачнай тэхнікі ў полі, а ў вольны час сам працуе камбайнерам





Фота з архіва ПАВЧ № 1.

Паводле аператыўных даных на 30 ліпеня, намалочана 1,75 мільёна тон збожжа. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Мінсельгасхарча.

Збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі і проса) убраны з 21 працэнта плошчы, што складае 411 тысяч гектараў. Сярэдняя ўраджайнасць вышэйшая за папярэдні год на 8,7 цэнтнера з гектара.

У Брэсцкай вобласці намалацілі 467 тысяч тон, Гродзенскай — 437 тыс. т, Мінскай — 402 тыс. т, Гомельскай — 211 тыс. т, Магілёўскай — 152 тыс. т, Віцебскай — 81 тыс. т.

Азімы ячмень убраны на 94 працэнтах плошчы, азімы рапс на зерне — на 160 тыс. га (42 працэнты палеткаў). Намалочана 917 тысяч тон азімага ячменю ўраджайнасцю каля 40 цэнтнераў з гектара, што таксама вышэй за мінулагодні на 7,6 ц/га, а таксама 338 тыс. т рапсу.

Выцераблена лёну на 16 тыс. га, што складае амаль 34 працэнты запланаванай плошчы. Скошана траў другога ўкосу на плошчы 784 тыс. га (73 працэнты плана), нарыхтавана сена 278 тыс. т (амаль 39 працэнтаў плана), сенажу — 10,8 млн т (77 працэнтаў плана), у тым ліку ў палімернай упакоўцы 295 тыс. т. Травяных кармоў нарыхтавана 3 млн 266 тыс. т — 32 працэнты да плана.

І пра цыгарэты трэба забыць, на полі такая звычка можа прывесці да непрыемных наступстваў.

Гэта лета чацвёртае, калі Станіслаў сумяшчае абавязкі ратавальніка і механізатара.

— У панядзелак ужо спрабавалі жаць авёс, — дзеліцца ён навінай. — Ураджай добры, палегліцы амаль няма. Будзе працы ўдосталь.

Успамінае, што цяжкасцяў у калгаснай рабоце хапае. Калісьці выязджаў з іншымі таварышамі па жніве ў Горацкі раён дапамагаць. Кожны дзень тэхніка гразла, адзін аднаго не паспявалі выцягваць.

Графік работы ў ПАВЧ зручны — суткі праз двое. Гэта дазваляе і адпачыць пасля працоўнай змены, і папрацаваць у калгасе. А калі жніво ў разгары, Станіслаў бярэ адпачынак і ўвесь час прысвячае працы ў полі. Упэўнены, што калі не ленавацца, то можна нядрэнна падзарабіць. Для маладой сям'і, у якой выхоўваецца двухгадовы малы, гэта добрая падтрымка. Малады бацька кажа, што, калі яго сын Яраслаў падрасце, таксама навучыць яго ўсім сакрэтам мужчынскай работы. Гэта вельмі важна, бо менавіта мужчына павінен забяспечваць сям'ю і не баяцца ніякай працы.

Суразмоўнік прызнаецца, што ў полі яму падабаецца. Яму не цяжка ўстаць, лічы, разам з сонейкам, прыехаць на мехдвор, агледзець камбайн, пачысціць яго, заправіць. Калі здараюцца паломкі, ён сам рамантуе. З калгаснай тэхнікай ратавальнік на «ты».

— Мой камбайн ужо «ва ўзросце», але мы з ім адзін аднаго разумеем, — жартуе суразмоўнік. — Вялікі плюс, што ёсць кандыцыянер. Цэлы дзень на спякоце цяжка было б вытрымаць. Новыя ж камбайны, канешне, больш дасканалыя. Там і з кіраваннем лягчэй, і бункер большы.

Асабісты рэкорд Станіслава па намалоце 950 тон. Але ён не выключае, што сёлета зможа яго пабіць.

— Праца нялёгкая: пыл, бруд, у полі ад світання да змяркання, — кажа ратавальнік. — Але сёння вельмі важна дапамагаць калгасам. У гэтай жа гаспадарцы, дзе я задзейнічаны, падпрацоўвае яшчэ і настаўнік фізкультуры. Дадатковыя працоўныя рукі на жніве вельмі патрэбныя. Было б добра, каб і моладзь убаку не заставалася, актыўней прапаноўвала сваю дапамогу. Не трэба саромецца, трэба працаваць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

* * *

По словах **афіцыйнага прадстаўніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Інэсы ЯЛФІМАВАЙ**, на 29 ліпеня ва ўборачнай кампаніі былі задзейнічаны 48 работнікаў МНС Магілёўскай вобласці і 24 адзінкі тэхнікі. Яшчэ 22 работнікі МНС працуюць камбайнерамі і памочнікамі камбайнераў у вольны ад нясення службы час. Усяго па краіне аграрыям дапамагаюць 212 ратавальнікаў.

# ЯКАСЦІ І БЯСПЕЦЫ

## асартыменту паставак сельгаспрадукцыі ў Кітай

«Беларускі бок выказаў зацікаўленасць у пашырэнні асартыменту паставак у Кітай, уключаючы розныя віды мукі, круп, вотруб'я, шматкоў (аўсяныя, ячменныя, грэчкавыя, кукурузныя, пшанічныя), а таксама нехарчовую прадукцыю, такую як рапсавы жмых і торф. Беларусь зацікаўлена ў пастаўках у Кітай гатовых да ўжывання прадуктаў з птушкі і ялавічыны, якія прайшлі тэрмічную апрацоўку, кансерваў з мяса птушкі», — адзначылі ў прэс-службе.

Юрый Горлаў таксама правёў перагаворы са **старшынёй Кітайскай асацыяцыі жывёлагадоўлі Цай Хуэйі**, дзе абмеркавалі пастаўкі сучаснага абсталявання і перадавых тэхналогій для свінагадоўлі і казаводства. Па выніках сустрэчы дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы візіту групы беларускіх экспертаў у Кітай для азнаямлення з дзейнасцю вядучых кітайскіх кампаній па профільных кірунках.

Беларусь значна інвестуе ў мадэрнізацыю галіны — у краіне функцыянуюць звыш 1,7 тысячы сучасных высокатэхналагічных малочных комплексаў, а да 2030 года плануецца поўны пераход дойнага статка на перадавыя тэхналогіі. У рамках стратэгіі развіцця ўльтрасучаснай свінагадоўлі на 2025–2034 гады запланавана будаўніцтва 12 свінагадоўчых комплексаў з прымяненнем сістэм біялагічнай абароны і лічбавага нагляду на базе штучнага інтэлекту.

Бакі прыйшлі да ўзаемаразумення па далейшым супрацоўніцтве ў галіне ўкаранення перадавых тэхналогій, уключаючы абмен вопытам па стварэнні сучасных малочных і мясных комплексаў з выкарыстаннем інавацыйных рашэнняў у кіраванні вытворчасцю.

Падчас візіту Юрый Горлаў сустрэўся таксама са **старшынёй Кітайскай Асацыяцыі агародніцтва Янам Сюннянем**. У мерапрыемстве ўдзельнічалі вядучыя кітайскія кампаніі, якія спецыялізуюцца на будаўніцтве цяпліц, рэкамендаваныя Асацыяцыяй. Па відэасувязі да сустрэчы падключыліся з Беларусі **намеснік міністра Уладзімір ГРАКУН** і прадстаўнікі беларускіх арганізацый-вытворцаў агароднінnай прадукцыі.

Бакі абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва ў галіне агародніцтва, у прыватнасці, пытанні будаўніцтва сучасных энергазберагальных цяпліц для круглагадовага вырошчвання агародніны. Па выніках перагавораў дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы візіту кітайскіх кампаній у Беларусь для правядзення прадметных перагавораў з беларускімі прадпрыемствамі.

Міністр азнаёміўся з дзейнасцю кампаніі «Цуйху», якая займаецца праектаваннем, вытворчасцю абсталявання і будаўніцтвам «пад ключ» аб'ектаў жывёлагадоўлі, цяпліц і рашэнняў для разумнай сельскай гаспадаркі. У ходзе наведвання аўтаматызаванай цяпліцы 5-га пакалення адбыліся перагаворы з кіраўніцтвам кампаніі.

Юрый Горлаў адзначыў, што ў Беларусі рэалізуецца Дактрына нацыянальнай харчовай бяспекі да 2030 года, якая вызначае стратэгічныя кірункі развіцця галіны. Ён падкрэсліў, што штогадовая вытворчасць агародніны ў краіне складае каля 580 тысяч тон, у тым ліку 107 тысяч тон вырошчваецца ў закрытым грунце на плошчы ў 233 гектары.

Нягледзячы на забяспечанасць патрэбнасці краіны такімі культурамі, як капуста, буракі, морква і цыбуля, неабходна нарошчваць вытворчасць таматаў, перцу і баклажанаў у зімовы перыяд. Для вырашэння гэтай задачы плануецца будаўніцтва новых энергазберагальных цяпліц, аснашчаных сістэмамі аўтаматычнага кіравання і механізаванымі вытворчымі працэсамі.

Перагаворы пацвердзілі высокую зацікаўленасць абодвух бакоў у развіцці супрацоўніцтва і стварэнні спрыяльных умоў для паставак сучасных тэхналогій у сферу агародніцтва.

### Тым часам

## ПРАДУКЦЫЯ ЗАПАТРАБАВАНА Ў РАСІІ

У Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання разгледзелі пытанні экспарту беларускай малочнай прадукцыі ў Расію, паведамілі ў прэс-службе Мінсельгасхарча.

Пашыраная нарада з кіраўнікамі і прадстаўнікамі вядучых прадпрыемстваў малочнай галіны краіны правёў **намеснік Прэм'ер-міністра па пытаннях дзейнасці Рэспублікі Беларусь у рамках Саюзнай дзяржавы і адносін з Расійскай Федэрацыяй, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Аляксандр РАГОЖНІК**. Мерапрыемства прайшло на базе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання пры ўдзеле прадстаўнікоў дзяржустаноў і банкаўскай сферы.

«Былі разгледжаны ключавыя пытанні, якія вызначаюць развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Асаблівая ўвага нададзена вынікам работы з расійскімі гандлёвымі сеткамі і перспектывам заключэння прамых дагавораў на пастаўкі беларускай малочнай прадукцыі», — адзначылі ў прэс-службе.

Удзельнікі нарады абмеркавалі варыянты і ўмовы супрацоўніцтва, пытанні лагістыкі, прававое забеспячэнне, фінансава-эканамічныя разлікі, а таксама механізмы фарміравання адпускных цэн на прадукцыю. Не засталіся без увагі пытанні пашырэння наменклатуры тавараў, якія пастаўляюцца, нарошчвання аб'ёмаў паставак і вытворчасці ўнікальнай прадукцыі, запатрабаванай на расійскім рынку.

Акцэнт быў зроблены на цэнавай палітыцы, забеспячэнні высокай якасці прадукцыі і арганізацыі экспартных паставак. Аляксандр Рагожнік падкрэсліў, што пасольства Беларусі ў Расіі садзейнічае беларускім вытворцам у заключэнні кантрактаў з расійскімі гандлёвымі сеткамі, і паставіў задачу актывізаваць работу ў гэтым кірунку. Ён адзначыў, што паспяховае развіццё галіны патрабуе зладжанай работы ўсіх удзельнікаў працэсу і максімальнай канцэнтрацыі намаганняў у дасягненні пастаўленых мэт.

Яшчэ адна нарада датычылася развіцця паставак беларускай мясной прадукцыі ў Расію. Цяпер работу з гандлёвымі сеткамі РФ вядуць 30 суб'ектаў гаспадарання сістэмы Мінсельгасхарча. Аляксандр Рагожнік падкрэсліў неабходнасць пераводу супрацоўніцтва на новы якасны ўзровень. Ён адзначыў, што беларуская прадукцыя вядомая і карыстаецца даверам расійскіх спажыўцоў. У буйных магазінах вялікіх гарадоў пад яе часта выдзяляюцца спецыяльныя брэндаваныя зоны — «астраўкі», што з'яўляецца эфектыўнай маркетынгавай стратэгіяй, якая прасоўвае наш тавар. Па выніках нарады Аляксандр Рагожнік акцэнтаваў увагу на ключавой ролі гандлёвых сетак у сучасных рынкавых умовах. Ён заклікаў прадпрыемствы актывізаваць намаганні і апярэджваць канкурэнтаў.

ПА СУТНАСЦІ

# СВОЙ ХЛЕБ



Лета — час натхнення, узнёслых і амбіцыйных задач. Час ужо не дзяцінства, а юнацтва. Нібы тыя птушаняты, на крыло становіцца наша моладзь. І так кожны год, дзесяцігоддзі запар. Такі кругазварот у прыродзе — энергія жыцця, законы часу. Такі і сярод нас — людзей. Пакаленні за пакаленнямі набываюць веды, выходзяць у дарослае жыццё, робяць нашу краіну лепшай, прыгажэйшай, мацнейшай. А ўсё пачынаецца з авалодання прафесіяй. І насамрэч інтарэс моладзі да той або іншай спецыяльнасці — люстэрка развіцця грамадства. Адказ на пытанне «У якім напрамку рухаецца наша Беларусь?»

Калі ў моладзі ёсць інтарэс да навукі, прага да ведаў, жаданне авалодаць прафесіяй, кампетэнцыямі, то гэта прыкмета здаровага грамадства. У сучасным свеце адзначаецца тэндэнцыя — стомленасць ад жыцця. Не ад працы, не ад цяжкасцяў — ад жыцця. Прычым стомленасць тая адзначаецца не ў людзей «сярэбранага» альбо сярэдняга ўзросту, а ў моладзі. І хтосьці нябачнай рукой знарок накручвае такія тэндэнцыі ў грамадстве. Мэта — відавочная: «стомленая» моладзь не адстаіць будучыню сваёй краіны.

А ў нас іншая сітуацыя. Актыўнасць падчас уступнай кампаніі сведчыць аб ініцыятыўнай жыццёвай пазіцыі новага пакалення, якое імкнецца да развіцця. Не пасіўнага жыцця, не «па цячэнні», а наперад — у будучыню. У гэтым значны рэзерв для развіцця краіны. Сёлетняя адметнасць — вялікі попыт на рабочыя спецыяльнасці. Гуманітарыі, палітолагі, гісторыкі, сацыяльныя камунікатары — усё гэта добра. І на гэтыя спецыяльнасці заўсёды вялікі конкурс. Але ж дзяржава існуе не толькі дзякуючы эканоміцы ведаў. Якія б зрухі ні анансавалі ў недалёкай будучыні — маўляў, штучны інтэлект, тэхналогіі, сфера паслуг, але без рэальнага ў эканоміцы не зможа існаваць ні грамадства, ні краіна.

У наш час глабальных перамен, пошуку далейшага развіцця, барацьбы за сусветнае лідарства дзьмуць не вятры, а нават ураганы і тарнада перамен. Аснова, фундамент — ежа, адзенне, тэхніка, будоўля, лекі... У гэтым чалавецтва заўжды будзе мець патрэбу. Без смартфонаў і софтаў пражыць можна, а без хлеба... Як некалі трапна заўважыў Першы: «Айфон на лусту хлеба не намажаш».

Віртуальныя кампетэнцыі заходнія «гаспадары» не аддадуць. Дык у нас ёсць свае нішы — спрадвечныя. А іх віртуальныя кампетэнцыі адлюстроўваюць і віртуальнасць унутранага валавога прадукту, і самой фінансавай сістэмы. Дарэчы, без звычайнай энергетыкі ўся тая сфера проста знікне — праверана досведам.

А яшчэ адна акалічнасць. «Тавары будучыні» — гэта асаблівая філасофія жыцця. Смарт-светапогляд. Дзе ні грамадзянства, ні якасці чалавека, ні яго перажыванні нікому не важныя, нават сам чалавек знаходзіцца ўбаку. Бессардэчная і прагматычная праграма алгарытмаў.

І тут галоўнае слова за новымі пакаленнямі. І вось наша моладзь зрабіла свой выбар. У Беларусі адзначаецца значная цікавасць да паступлення ў каледжы, асабліва пасля 9-га класа. Гэта звязана з жаданнем моладзі атрымаць прафесійную адукацыю і пачаць працоўную дзейнасць раней, а таксама з магчымасцю навучання на бюджэтнай аснове ў каледжах. Вельмі вялікія конкурсы і прахадныя балы менавіта ў сярэдніх спецыяльных навучальныя ўстановы. Напрыклад, нават падчас падачы дакументаў у Мінскі дзяржаўны тэхналагічны каледж, Мінскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы каледж і Беларускі дзяржаўны медыцынскі каледж чарга была — не праціснуцца. А гэта сведчыць адразу пра некалькі становучых тэндэнцый.

Па-першае, мы не паддаліся таму глабальнаму ціску «заходніх сэнсаў». І не страцілі адну з адметных рыс нацыянальнага характару — захавалі працавітасць. Не перакадзіравалі нас ні ў нацыю «чаўнакоў», ні ў нацыю афіцыянтаў, ні ў нацыю смарт-менеджараў. Мы засталіся нацыяй хлебаробаў і будаўнікоў, урачоў і настаўнікаў, навукоўцаў. Гэта ўдалося дзякуючы ўзважанай дзяржаўнай палітыцы і запыту самога грамадства. Бо працавітасць народа — інвестыцыя не толькі ў эканоміку, гэта наратыў традыцыйнага грамадства.

А яшчэ важней, што інфармацыйныя, ментальныя тэхналогіі не перакадзіравалі нашых дзяцей. Яны шануюць спрадвечную працавітасць продкаў. Канешне, тут прысутнічае і прагматызм, але і ў гэтым вялікі сэнс. Дзеці імкнуцца дапамагчы бацькам, беларуская моладзь мэтанакіравана выбірае карацейшы шлях да свайго заробку. А пасля можна і вышэйшую адукацыю атрымаць.

У краіне старанна створана практычная вертыкаль атрымання ведаў. Прычым кажуць, што менавіта студэнты з ведамі з каледжаў больш матываваныя і дасягаюць найлепшых поспехаў. І заробкаў. Бо ў нашай краіне няма запыту на фэйкавых герояў, у цэнтры ўвагі не кіношныя прадстаўнік офіснага планктону, а чалавек працы, работнік рэальнага сектара эканомікі. І справа тут не толькі і не столькі ў фінансавых паказчыках, а ў здаровай жыццёвай філасофіі грамадства, якая супадае з дзяржаўнай палітыкай. І вельмі радасна, што наша моладзь выбірае спрадвечную дарогу да шчасця — шлях стваральнай працы.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# СТАЎКА НА ІНВЕСТЫЦЫІ І

## Складнікі эканамічнага развіцця Міншчыны

Мінская вобласць уносіць значны ўклад у развіццё эканомікі краіны — праз маштабныя вытворчасці, вядучыя брэнды і інавацыйныя праекты. Рэгіён традыцыйна застаецца адным з ключавых у эканамічным жыцці краіны: у мінулым годзе яго доля ў фарміраванні валавога ўнутранага прадукту склала больш за 18 %. А валавы рэгіянальны прадукт за 2024 год склаў 105,3 % у супастаўных цэнах да 2023-га.




Як паведаміла **начальнік упраўлення прамысловасці камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Ала СУШКО**, вядучае месца ў эканоміцы вобласці займае прамысловасць — тут выпрацоўваецца больш за 22 % ад усіх аб'ёмаў прамысловай прадукцыі краіны. Яна зазначыла, што сярод асноўных галін — вытворчасць калійных угнаенняў, легкавых аўтамабіляў і кар'ерных самазвалаў, фармацэўтычных прэпаратаў, ювелірных вырабаў, макаронных вырабаў, мінеральных вод.

Міншчына таксама спецыялізуецца на шэрагу стратэгічных кірункаў. Не толькі ў краіне, але і далёка за яе межамі добра ведаюць прадпрыемствы, якія

# ШЭФ, ПА ДВАЙНЫМ ТАРЫФЕ?!

## У Мінтрансе далі рэкамендацыі пасажырам, як пры замове аўтамабіля-таксі «ад борта» не даць сябе падмануць

При замове паслуг таксі без выкарыстання інфармацыйных сістэм, мабільных дадаткаў, паслуг дыспетчара (так званыя паездкі «ад борта») ёсць выпадкі выканання перавозкі пасажыраў па неабгрунтавана завышаных тарыфах, распавялі ў профільным ведамстве. У сувязі з гэтым звярнулі ўвагу пасажыраў на наступную інфармацыю.

Дзяржавай рэгулююцца цэны (тарыфы) на сацыяльна значныя тавары (паслугі). Перавозкі пасажыраў аўтамабілямі-таксі да такіх паслуг не адносяцца. Тарыфы на перавозкі аўтамабілямі-таксі ўстанаўліваюцца суб'ектамі гаспадарання самастойна зыходзячы з кан'юнктуры рынку ва ўмовах свабоднай канкурэнцыі.



У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам спажывец мае права на інфармацыю пра паслугі. Па правілах аўтамабільных перавозак пасажыраў у салоне аўтамабіля-таксі на бачным для пасажыра месцы павінны быць размешчаны:

— візітная картка, якая змяшчае прозвішча і ініцыялы кіроўцы, а таксама яго фатаграфію;

— інфармацыя аб назве (прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), месцы знаходжання (месцы жыхарства) і кантактных тэлефонах перавозчыка;

— інфармацыйная таблічка з указаннем усіх выкарыстаных перавозчыкам тарыфаў: тарыф за 1 км (днём і ноччу), за межамі горада, кошт абаніравання, кошт пасадкі, прастою, замовы таксі па тэлефоне, іншыя тарыфныя ўмовы.

Па правілах аўтамабільных перавозак пасажыр таксі мае права пры афармленні заказу на паездку атрымліваць інфармацыю пра тарыфы і арыенціровачныя кошты паездкі, а таксама пра іншыя ўмовы яе выканання.

— У сувязі з гэтым рэкамендуем пры замове аўтамабіля-таксі «ад борта» ўдакладняць у кіроўцы арыенціровачны кошт паездкі ў рублях. Фразы «па лічыльніку», «па тарыфах» і іншыя аналагічныя могуць служыць сігналам да таго, што вас спрабуюць увесці ў зман, — падкрэслілі ў Мінтрансе.

Тут дадалі, што ў адпаведнасці з Законам «Аб абароне правоў спажыўцоў» устаноўлены абавязак выканаўцы (кіроўцы, перавозчыка) своечасова даць пасажыру неабходную і дакладную інфармацыю аб цане (тарыфах) паслугі і ўмовах яе аплаты.

— У выпадку непрадстаўлення дадзенай інфармацыі спажывец мае права скасаваць дагавор перавозкі пасажыра аўтамабілем-таксі і запатрабаваць вярнуць грашовыя сродкі, выплачаныя за аказаную паслугу, — пракаментавалі ў ведамстве.

Таксама тут растлумачылі, што пасажыр мае права адмовіцца ад аплаты паездкі ў выпадку аказання паслугі па перавозцы з няспраўнымі, выключанымі (заблакіраванымі) праграмнай касай для таксі або касавым апаратам, сумешчаным з таксометрам, за выключэннем выпадкаў выканання перавозкі аўтамабілямі-таксі, замоўленай і аплачванай з дапамогай электроннай інфармацыйнай сістэмы з выкарыстаннем рэквізітаў банкаўскіх плацежных картак.

— Паважаныя пасажыры, будзьце максімальна пільнымі і ўважлівымі пры замове аўтамабіля-таксі «ад борта», — заклікалі ў ведамстве.

# ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ

з'яўляюцца сапраўдным гонарам беларускай эканомікі: «Беларуськалій», «БелАЗ». Апошнім часам на міжнародным рынку гучна заявілі аб сабе і іншыя прадпрыемствы: «БелДжы» (у 2024 годзе выпусціла больш за 90 тысяч легкавых аўтамабіляў), «БНБК» (ажыццяўляе выпуск кармавых амінакіслот, камбікармоў і прэміксаў, глютэну пшанічнага і шэрагу іншых прадуктаў глыбокай перапрацоўкі збожжа).

Значную ўвагу рэгіён удзяляе інавацыям. Сярод праектаў, унесеных у дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця, Ала Сушко назвала «Слуцкі сыраробны камбінат», агракамбінат «Дзяржынскі», «Амкадор-Семаш», «Слуцкі мясакамбінат» і інш. На працягу апошніх дзесяці гадоў Мінская вобласць прыцягвае найбольшы ў краіне аб'ём інвестыцый у асноўны капітал — больш за 25 % ад агульнага аб'ёму інвестыцый у краіне. У цяперашняй пяцігодцы завершана рэалізацыя буйных праектаў: арганізацыя высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыкла («БНБК»), стварэнне сучаснай гнуткай аўтаматызаванай вытворчасці вузлоў рулявога кіравання для камплектацыі аўтамабільнай тэхнікі (Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік») і інш. Значная частка інвестпраектаў накіравана на вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі, аб'ёмы якой, дарэчы, за апошнія пяць гадоў павялічыліся ў 2,6 раза. Акрамя таго, у пералік інвестыцыйных праектаў «Адзін раён — адзін праект» на гэты год уключана 48 ініцыятыў з агульнай сумай кошту 1,9 мільярда рублёў. Паводле плана, у выніку іх рэалізацыі будзе створана больш за 2000 новых працоўных месцаў.




**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

# ПАРТНЁРСТВА, ПРАВЕРАНАЕ ЧАСАМ




## За 14-гадовае існаванне сумеснае беларуска-кітайскае прадпрыемства «БелДжы» вырабіла больш за 300 тысяч аўтамабіляў

Аб гэтым паведаміў міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ падчас перагавораў з намеснікам міністра прамысловасці і інфарматызацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі Сінь Габінем.

Як паведамілі ў прэс-службе Мінпрама, бакі прадметна абмеркавалі вынікі і перспектывы кітайска-беларускага прамысловага супрацоўніцтва.

— Сумеснае беларуска-кітайскае прадпрыемства СЗАТ «БелДжы» створана па даручэнні кіраўнікоў дзяржаў. Гэта ўзор беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Праекту ўжо 14 гадоў, і ён дэманструе ўсепагоднае сяброўства Кітая і Беларусі. Завод вырабіў больш за 300 тысяч аўтамабіляў, праводзіць маштабную мадэрнізацыю, пачынае вытворчасць аўтамабіляў на новых відах паліва, — падкрэсліў Андрэй Кузняцоў.

Супрацоўніцтва кітайскіх і беларускіх прамысловых прадпрыемстваў развіваецца досыць інтэнсіўна ў розных напрамках і ўключае пастаўкі шырокай наменклатуры запасных частак, тэхналагічнага абсталявання, сыравіны і матэрыялаў, а таксама стварэнне і функцыянаванне сумесных прадпрыемстваў. У гэтай сувязі на перагаворах былі разгледжаны магчымасці для далейшай лакалізацыі вытворчасцяў.

Міністр прамысловасці Беларусі з задавальненнем канстатаваў выніковае стратэгічнае ўзаемадзеянне з буйнымі кітайскімі карпарацыямі.

— Дзякуючы супрацоўніцтву з кітайскімі кампаніямі, вырабленая ў Беларусі прадукцыя павысіла сваю канкурэнтаздольнасць на рынках трэціх краін, а таксама змагла забяспечыць унутраныя патрэбы краіны, — адзначыў Андрэй Кузняцоў.

Тэмай перагавораў стала дзейнасць камісіі па прамысловым супрацоўніцтве Беларусі і Кітая. Камісія была створана ў маі бягучага года падчас шостага пасяджэння беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве.

Андрэй Кузняцоў і Сінь Габінь абмеркавалі планы па правядзенні першага пасяджэння камісіі па прамысловым супрацоўніцтве, пытанні паглыблення супрацоўніцтва, рэалізацыі сумесных прамысловых праектаў, якія спрыяюць развіццю эканомік дзвюх краін.

# ПРАМЫ ШЛЯХ ДА СПАЖЫЎЦА

## Для айчынных вытворцаў адкрываюцца новыя магчымасці экспарту тавараў у аддаленыя рэгіёны Расіі

Такое меркаванне агучыла намеснік міністра эканомікі Алеся АБРАМЕНКА падчас цырымоніі адкрыцця філіяла «Чыгункі Якуціі» ў Мінску.

Дарэчы, адкрываў прадстаўніцтва першы намеснік Старшыні Урада Рэспублікі Саха (Якуція) Андрэй Фядотаў.

У сваю чаргу Алеся Абраменка адзначыла, што ў айчынных вытворцаў з'яўляюцца новыя магчымасці для пастаўкі сваёй прадукцыі ў самыя аддаленыя рэгіёны Расіі.

— Адкрыццё прадстаўніцтва — важны крок насустрач інтэграцыі нашых транспартных сістэм. Мы ствараем новую мадэль лагістыкі, якая дазволіць нарошчваць узаемныя пастаўкі, выключыць лішніх пасрэднікаў, знізіць выдаткі на дастаўку. Нашым вытворцам неабходна актыўна выкарыстоўваць перспектывы, — падкрэсліла яна.

У Мінэканомікі растлумачылі, што адкрыццё філіяла дазволіць фарміраваць кантэйнерныя цягнікі, што павялічыць аб'ёмы грузаперавозак. Дасць магчымасць скараціць колькасць пасрэднікаў у ланцужку паставак, што істотна знізіць выдаткі бізнесу і павысіць канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі ў рэгіёне. Акрамя гэтага, спросціцца лагістыка: тэрмін дастаўкі прадукцыі скароціцца да 11 дзён.




ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
